**Таполя С. А. Умрэйкі**

Дрэва пасаджана ў гонар вядомага вучонага, прафесара педагогікі Сцяпана Андрэевіча Умрэйкі вучнямі ў 1959 годзе (год адкрыцця новай Песачанскай сярэдняй школы).



Месца пасадкі дрэва выбрана невыпадкова. Менавіта тут да вайны быў культурны і адміністрацыйны цэнтр Пясочнага. Да вайны тут знаходзіліся сельсавет і хата-чытальня. Злева – магазін гаспадарчых тавараў і сталовая, або “чайная”, як яе называлі мясцовыя жыхары. Справа быў вялікі, прыгожы драўляны клуб, высокі, з галёркай. У клубе гулялі ў більярд, танцавалі, ставілі спектаклі. Кожную нядзелю настаўнікі чыталі лекцыі для насельніцтва. Цераз дарогу размяшчаліся кляновы парк і яўрэйскі квартал, непадалёк – рыначная плошча і царква.

У гады вайны Пясочнае двойчы бамбілі немцы. Было спалена некалькі дзясяткаў дамоў, мост праз раку Нёман. Амаль усе адміністрацыйныя і культурныя збудаванні вёскі былі знішчаны. За час акупацыі загінула каля 278 жыхароў вёскі.

Але, нягледзячы на цяжкія страты, пасля вайны Пясочнае пачало нанава адбудоўвацца і прывыкаць да мірнага жыцця. Асабліва паспрыяў развіццю вёскі наш знакаміты зямляк С. А. Умрэйка, які амаль 16 гадоў займаў пасаду намесніка міністра асветы БССР. Дзякуючы яго намаганням у Пясочным пабудавалі жалезабетонны мост праз Нёман, вялікі і шматфункцыянальны Дом культуры з кіназалам і балконам, двухпавярховую школу з прасторнымі класамі. А школьнікі на пачатку заняткаў у новай школе прымалі ўдзел у добраўпарадкаванні вёскі – саджалі ліпы і таполі пад кіраўніцтвам настаўніцы біялогіі Вялешка В. А. І самае вялікае дрэва вырашана было пасадзіць у гонар С. А. Умрэйкі іменна на гэтым месцы – месцы былога культурнага цэнтра вёскі. Гэтае дрэва – сімвал удзячнасці і пашаны таленавітаму, інтэлігентнаму, простаму і душэўнаму чалавеку, які, хоць і жыў у сталіцы, але не забываўся пра родны край, клапаціўся пра яго культурнае развіццё. Жыццё Сцяпана Андрэевіча – прыклад высокага служэння Бацькаўшчыне і сваім землякам.